№3 СТУДЗЕНЬ 2008

# Настаўнік.info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

# Што было? Што будзе?..

## Навагоднія нататкі рэдактара

Шаноўныя калегі!

На Новы год прынята падсумоўваць падзеі ды рабіць прагнозы. Што адбылося ў адукацыі ў 2007 годзе, узгадаць няцяжка. Падзеяў было няшмат. Можна сказаць, нічога нечаканага. Агульны стан стабільнай стагнацыі грамадства з паступовым закручваннем ідэалагічных гаек не абмінуў і адукацыйную сферу. У познюю брэжнеўскую пару назіралася нешта падобнае, але ад нас Масква была далёка, рукі ейных спецслужбаў не такія ўжо і доўгія, і ні настаўнікі, ні адукацыйнае начальства не спяшаліся выконваць загады, фармалізаваўшы да смеху ўсе ідэалагічныя інстытуты і давеўшы стан падвойнай маралі да нормы грамадства.

Зараз крыху інакш. Хапнуўшы глыток свабоды ў пачатку 90-х, не ўсе згаджаюцца надалей дыхаць спёртым паветрам застою, хаваць сваё сапраўднае жыццё і сапраўдныя думкі ў межах уласнай кухні. Ды і прастора інтэрнэту дазваляе мець праўдзівую інфармацыю пра свет, стан грамадства, палітычныя падзеі, культуру, літаратуру. Вось і падзялілася настаўніцтва на дзве катэгорыі. Першая – свабодныя людзі ў несвабоднай школе. Іх баяцца, паважаюць, ім зайздросцяць. Іх няшмат, але дастаткова, каб не згубіць наступнае пакаленне. Другая – канфармісты-баязліўцы. Яны баяцца. Яны зайздросцяць. Іх не паважаюць. Іх шмат. Перафразуючы Ўінстана Чэрчыля, гэта тыя 90 працэнтаў настаўнікаў, якія робяць кепскі імідж 10-ці астатнім. Ім жыць нашмат цяжэй, бо, як кажуць, смелага і куля абмінае, а ім, бедным, дастаецца і ад тых, і ад гэтых.

Але узгадаем, што ж адбылося ў адышоўшым годзе.

1) "Белую Русь" узначаліў міністр адукацыі. Падзея прадказальная. Настаўнікаў пачалі прымусова падпісваць у гэты "БРСМ для дарослых" ужо за паўгода да стварэння. Як шчыра прызнаўся міністр, Белая Русь будзе ўдзельнічаць у выбарах. Значыць, "элегантная перамога"-2008 зноў будзе рабіцца настаўніцкімі рукамі. Наперад, дарагія калегі! Толькі пачытайце, калі ласка, артыкул на другой старонцы гэтага бюлетэню пра тое, што прыйшлося перажыць служкам недэмакратычнага рэжыму ў былой ГДР. Думаеце ў нас будзе інакш? Свабодных настаўнікаў гэтае пытанне, як і ўласна "Белая Русь", не цікавіць. А астатнім 90% калегаў пакуль яшчэ ёсць час прыдумаць прычыну, каб не ўвайсці ў склад выбарчых камісіяў. Ці, можа, ўвайсці і не падпісаць невядомы пратакол. А можа не падпісаць і заявіць пра гэта публічна… Ну, гэта проста святочныя мары.

2) Нарэшце быў канчаткова разбураны міф пра якасць савецкай сістэмы адукацыі. Паводле дадзеных даследаванняў PISA (Programme for International Student Assessment) Расія заняла 33-38 месца з 57 і патрапіла ў катэгорыю адсталых краінаў. Апошняе, 57-е месца заняла Кіргізія – таксама спадкаемца савецкай адукацыйнай сістэмы. Даследаванні закранылі такія галіны навук, як фізіка, хімія, біялогія, геаграфія, а таксама тычыліся тэхналогіяў, якія патрабуюць навуковых ведаў. Дарэчы, менавіта веды ў галіне прыродазнаўчых навук лічыліся заўсёдным гонарам савецкай адукацыйнай сістэмы.

У Расіі шок. Яны на ўсіх узроўнях абмяркоўваюць неабходнасць рэформы адукацыі. Як кажуць, мы з імі з адной пясочніцы, і ёсць над чым задумацца. А ў нас працягваюць захоўваць старыя савецкія метады, можа таму, што галоўны педагог краіны іншых не вывучаў. У дадатак, зачыняюць класы з развіццевым навучаннем, спыняюць мультыпрофільнае навучанне ў старэйшай школе. Прагноз вядомы: і ў новым годзе наватараў будуць вітаць толькі на паперы. У сэнсе, папяровых наватараў. Чым больш рознакаляровых папачак на паліцы ў настаўніка, тым лепш для шматлікіх праверак. А ў класе рабі, што сумленне дазваляе! Можна проста эканоміць сілы для рэпетытарства. Гэты ценевы бізнэс, падобна, пакуль чапаць не будуць. А то раптам хто з настаўнікаў і не падпіша той элегантны пратакол.

3) Канчаткова нашая сацыяльна-арыентаваная краіна адмовілася ад сваёй сацыяльнай арыентацыі. Адукацыя ўжо амаль на 60% платная (гэта без уліку рэпетытарства і набыцця балу атэстата), за ЦТ бацькам нашых выпускнікоў прыйдзецца выплаціць дзяржаве каля 7 мільёнаў долараў, ільготаў пазбавілі нават інвалідаў, настаўніку рыхтуюць толькі 24 дні аплочанага адпачынку, пра бясплатную медыцыну можна забыцца, а яна, дарэчы, як і бясплатная адукацыя, гарантаваная нам Канстытуцыяй. Але які гарант, такая і гарантыя.

4) А зараз пра добрае. У 2007 г. ва ўсе беларускія школы Мінска прыйшло больш першакласнікаў, чым летась. З ініцыятывы бацькоў новыя беларускія групы ў садочках адчыніліся ў Мінску, Магілёве, Гродне. У Бярозе набралі першы беларускі клас. Гэтым дзецям і іх настаўнікам імкнецца дапамагчы ўся беларуская грамада. Беларусы Нью-Ёрку перадалі навагоднія падарункі, "Таварыства беларускай школы" - кніжкі, канадскія дзеці для беларускіх звязалі процьму шалікаў. І няхай там-сям прапушчанае вочка, але грэе гэты шалік нашмат больш. Хочацца верыць, што стварэнне нацыі беларусаў працягнецца і будзе набіраць моц і сёлета.

Напрыканцы назіранні, не звязаныя наўпрост з адукацыяй. Цікава, як толькі каго пачынаюць хваліць ці падтрымліваць беларускія афіцыйныя ўлады, – тыя адразу прайграюць. А як каго ганьбяць – тыя перамагаюць. Памятаеце, як супраць Юшчанкі ўсе бэтэшныя каналы выступалі, а там усё добра, дзякуй богу, дэмакратыя перамагла і краіна развіваецца. Немцы правялі даследаванні і сказалі, што ва Ўкраіне найлепшыя ўмовы для развіцця адукацыі сярод краінаў СНД. А вось толькі Венесуэлу пачалі хваліць ды лепшым сябрам называць – прайграў Чавес рэферэндум, спланаваны па беларускім сцэнары. Не дазволіў яму народ быць пажыццёвым прэзідэнтам. Можа таму, што тамтэйшыя настаўнікі проста сумленна лічылі галасы?

З Новым Годам, дарагія калегі! Зычу вам плёну і павагі. І крый божа, каб вас пачало хваліць нашае начальства. Прайграем усе!

*Алена Чмель.*

**ЯК АДБЫВАЛАСЯ РЭФОРМА АДУКАЦЫІ Ў БЫЛОЙ ГДР >>> СТАР. 2**

**НОВЫЯ МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ >> СТАР. 4**

РЭФОРМА АДУКАЦЫІ



# Д-р Гельмут Габэрлант: Сістэма адукацыі дэмакратычнай краіны можа абапірацца толькі на дэмакратычных супрацоўнікаў

**Настаўнік.інфо вывучае сітуацыю з посткамуністычным рэфармаваннем сістэмы адукацыі. Госць нашага выдання - кіраўнік аддзелу Міністэрства адукацыі, моладзевай палітыкі і спорта зямлі Брандэнбург (ФРГ) доктар Гельмут Габэрлант (Helmut Haberlandt), які паводле сваёй пасады пасля аб'яднання Германіі займаўся на сваёй адміністрацыйнай тэрыторыі пераводам школ ГДР на дэмакратычныя рэйкі.**

**- Спадар Габэрлант, вядома, што ГДР, як і Беларусь у 90-х гадах пачала посткамуністычную рэформу сістэмы адукацыі. Але ў нашай краіне яна вельмі хутка прыпынілася, і сістэма адукацыі пакуль застаецца савецкай і па змесце, і па сістэме кіравання. Працэс трансфармацыі ў нас яшчэ наперадзе. Мы б хацелі ведаць, што рабілі немцы ў пераходны перыяд? З якімі праблемамі сутыкнуліся?**

- Пачалі з пераасэнсавання. Пасля аб'яднання Германіі ў 1989 г. існавала 2 падыходы да пераасэнсавання мінулага: 1) пераасэнсаванне зместу адукацыі 2) пераасэнсаванне складу калектываў. Мар'яна Біртлер, якая змяніла Ёахіма Гаўка на пасадзе Федэральнага Упаўнаважанага ў справах архіваў штазі (Stasi – усходнегерманскі аналаг КДБ – ТМ), падрыхтавала рэферат па расследаванні мінулага і спрыянні дэмакратызацыі структуры адукацыі.

**- Раскажыце, калі ласка, падрабязней пра змястоўны бок рэформы.**

- Мы зыходзілі з таго, што ўсе настаўнікі павінны задумацца пра тое, што яны выкладалі (па змесце) падчас існавання ГДР. Дзеля гэтага былі арганізаваныя меры па перакваліфікацыі. Трэба адзначыць, інтарэс настаўнікаў не быў вялікім. Таму Міністэрствам была ініцыяваная праграма па асэнсаванні мінулага. Быў абвешчаны конкурс ва ўсіх сродках масавай інфармацыі на тэму "Гісторыя, структура і функцыяванне ГДР-аўскай сістэмы адукацыі", праводзіліся навуковыя даследаванні. У працэсе 3-х гадовай навуковай работы быў надрукаваны прэс-рэліз пра вынікі даследаванняў. А самі вынікі пазней былі выдадзеныя ў чатырох тамах. Першы том выйшаў у 1993 г. і меў назву "Школа ДСП" (ДСП – сакрэтны грыф "для служебного пользования", добра знаёмы і беларусам, звязаным з дзяржаўнымі сакрэтамі – ТМ), другі том называўся "Пастраенне ў шарэнгу", трэці – "Дружба!" і чацвёрты "Кірунак на Торгаў". Гэтая праца была недарэмнай. Толькі асэнсаваўшы тое, што было, можна ўсвядоміць, як рэфармаваць сістэму.

**– Адукацыя – справа асобаў. Што рабілі пасля лістапада 1989 г. з тымі настаўнікамі, якія прызвычаіліся да савецкіх метадаў? Перавучвалі? Звальнялі?**

– Сістэма адукацыі дэмакратычнай краіны можа абапірацца толькі на дэмакратычных супрацоўнікаў. Таму пераасэнсаванне супрацоўнікаў тычылася не толькі міністэрства адукацыі. Прававыя асновы для кадравых зменаў, былі закладзены ў Дагаворы аб аб'яднанні ГДР і ФРГ, дзе прадугледжвалася, што ўсе дзяржаўныя службоўцы, у тым ліку і настаўнікі, застануцца на сваіх месцах. У той час сярод настаўнікаў ГДР было шмат асобаў, якія ўжывалі метады, што аказвалі ціск на вучняў, нават даходзіла да парушэння правоў чалавека. Вышэйузгаданы дагавор пра аб'яднанне дазваляў у выпадку парушэння правоў чалавека звольніць любога супрацоўніка дзяржструктуры. Былі створаныя камісіі па пытаннях супрацоўнікаў. Гэта былі грамадскія камісіі, якія і займаліся пытаннямі звальнення супрацоўнікаў.

**– Скажыце, як адбываўся працэс звальнення настаўнікаў, як іх знаходзілі, каго звальнялі ў першую чаргу?**

– Пасля ўтварэння зямлі Брандэнбург былі разасланыя анкеты да ўсіх настаўнікаў нашай зямлі. Пытанні анкеты тычаліся прафесійных якасцяў, функцыяў, якія выконваў настаўнік ў школах і структурах адукацыі, грамадскім жыцці, стасункаў з органамі бяспекі. Пасля лістапада 1989 г. гэтыя анкеты былі сабраныя і апрацаваныя. Камісіі па справах супрацоўнікаў, у якія ўваходзілі зямельны савет, прадстаўнікі цэркваў, кансультанты па адукацыі, раённыя саветы, вызначылі, каго з настаўнікаў трэба запрасіць на слуханні, а каго не. Гэта быў першы этап адбору супрацоўнікаў. На гэтым этапе быў разгледжаны кожны выпадак кожнага асобнага чалавека. Рашэнні камісіі прымаліся індывідуальна.

**– Ці азначае гэта, што настаўнік, які раней рабіў супрацьпраўныя дзеянні, актыўна выслужваўся перад ГДР-аўскімі ўладамі, але не указаў гэта ў анкеце, мог застацца на працы?**

– Для таго, каб такое не здарылася, на другім этапе праводзілася праверка, ці працаваў той ці іншы настаўнік на штазі. Камісія па пытаннях супрацоўнікаў рабіла запыты ва "Установу Гаўка" (гл. каментар П. Садоўскага). Гэтае ведамства выдала даведкі кожнаму раённаму савету па пытаннях адукацыі, і гэтыя даведкі параўноўваліся з анкетамі, якія запаўнялі настаўнікі на першым этапе. Калі у анкеце настаўніка на пытанне пра супрацоўніцтва з органамі бяспекі ці іншае супрацьпраўнае дзеянне быў адказ НЕ, а даведка казала пра адваротнае, прызначаліся дадатковыя слуханні, якія ў абсалютнай большасці сканчаліся звальненнем. Для дапамогі раённым саветам ў справе слуханняў ў міністэрстве па адукацыі, моладзевай палітыцы і спорту была створана рабочая група. Яе задачай была распрацоўка нарматыўнай базы, кансультаванне раённых саветаў. Часам у міністэрстве таксама праходзілі слуханні.

**– Вернемся да змястоўнага боку рэформы. Як памяняліся школьныя праграмы? Ці былі яны ўніфікаваныя з праграмамі ФРГ?**

– Змест адукацыі вызначаецца на ўзроўні зямлі. Зямельны савет па адукацыі мае правы ўносіць папраўкі ў праграмы навучання. Усе 16 зямель, з якіх складаецца Германія, маюць свае ўласныя праграмы. Яны могуць істотна адрозніваццa. Напрыклад, праграма "Дэмакратычна вучымся і жывем" была уведзена не ва ўсіх землях і не ва ўсіх школах. Збольшага яе прынялі школы, дзе былі праблемы з экстрэмісцкімі групоўкамі, міжнацыянальныя канфлікты. Дэмакратыя прадугледжвае ўдзел у прыняцці рашэнняў, і змест адукацыі не выключэнне. Можна рабіць выбар і вывучаць тое, што больш патрэбна для жыцця.

**– Наколькі самастойныя школы зямлі Брандэнбург?**

– Мы колькі год імкнемся пашыраць самастойнасць школы. Важна, каб большасць рашэнняў прымалася на

## Д-р Гельмут Габэрлант: Сістэма адукацыі дэмакратычнай краіны можа абапірацца толькі на дэмакратычных супрацоўнікаў

школьным узроўні. Раней школы не маглі самастойна выдаткоўваць сродкі на мэблю, камп'ютэры, зараз могуць. Інфраструктура школы (будынак, кнігі, камунальныя паслугі) аплочваецца з раённага бюджэту. Камісіі па найманні супрацоўнікаў даюць рэкамендацыі дырэктару. Дырэктар школы ўпаўнаважаны наняць і звольніць супрацоўніка. Дырэктара прызначае дэпартамент па адукацыі. Але мясцовае самакіраванне падключаецца да выбару кандыдатуры дырэктара. Органы ўдзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў у справе адукацыі існуюць на ўсіх узроўнях: зямлі, раёна, школы, класа.

**– Скажыце, ці зважае школа на каштоўнасці?**

– Каштоўнасці маюць важнае месца ў нямецкай школе. Яны павінны адкрыта абмяркоўвацца, выпрабоўвацца ва ўласнай дзейнасці. Удзел у прыняцці рашэнняў – галоўная дэмакратычная каштоўнасць. Нам доўгі шлях яшчэ належыць прайсці да ўсведамлення гэтага.

**– Дзякуй за размову. Мы спадзяемся, што Ваш досвед дапаможа ў дэмакратызацыі беларускай сістэмы адукацыі.**

– Я перадаю беларусам кнігі з нашымі даследаваннямі і крокамі рэформаў. І шчыра жадаю Вам поспехаў.

*Гутарыла Тамара Мацкевіч, снежань 2007 г.*

# КАМЕНТАР ДА ТЭМЫ АД ПЯТРА САДОЎСКАГА*

*** Пётра Садоўскі – германіст, першы амбасадар Беларусі ў Германіі (1992-1994 гады), кандыдат філалагічных навук, дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі 12 склікання.**



Школьныя настаўнікі маюць у ФРГ статус дзяржаўных службоўцаў (Beamte), і адпаведна гэтаму пасля аб'яднання ФРГ і ГДР настаўнікі ГДР павінны былі прайсці праз працэс, якія можна ўмоўна назваць люстрацыяй або праверкай на лаяльнасць.

Усягэта працэдура праводзілася ў межах агульнадзяржаўнай кампаніі "крытычнай ацэнкі мінулага" (Vergangenheitsaufarbeitung), якая тычылася пакаяння ўсіх немцаў за 12 гадоў нацыянал-сацыялізму і аналізу гдр-аўскага мінулага (DDR-Aufarbeitung).

У ГДР гэты працэс пачаўся па ініцыятыве дэмакратычнага вызвольнага руху "Новы Форум", які змог яшчэ ў апошнія дні існавання ГДР прымусіць дэмаралізаваны камуністычны парламент (Volkskammer – Народная палата) прыняць пастанову пра архівы штазі (скарачэнне ад Staatsicherheit – дзяржбяспека). Адбылося гэта 2 кастрычніка 1990г. На гэтым жа пасяджэнні беспартыйны грамадзянін, 50-гадовы святар Ёахім Гаўк ( Joachim Gauck), актывіст "Новага Форуму" і ягоны прэсавы сакратар быў абраны Упаўнаважаным у справах архіваў штазі.

На другі дзень гэтая пастанова была афіцыйна прызнаная ў ФРГ канцлерам Колем і прэзідэнтам Вайцзэкерам. Ужо ў аб'яднанай ФРГ Гаўк атрымаў афіцыйную пасаду "Спецыяльнага Федэральнага упаўнаважанага па асабістых справах грамадзянаў у архівах былой службы бяспекі ГДР". Яму была падпарадкаваная спецыяльная установа, што складалася з 2000 супрацоўнікаў. Яна мела вельмі доўгую назву, таму ў народзе яе проста сталі называць Gauck-Behörde ("Установа Гаўка"). Ад імя установы быў выдадзены зварот да грамадзян ГДР зрабіць афіцыйную заяву пра сваё супрацоўніцтва са штазі, калі яно мела месца. Нешта накшталт царкоўнай споведзі. Адпаведна абяцалася індульгенцыя, калі супрацоўніцтва не было прычынай цяжкіх злачынстваў. Той, хто ўтойваў сваё супрацоўніцтва, рызыкаваў мець адпаведныя непрыемнасці.

Магчымыя злачынствы агентаў штазі падзяляліся на тры катэгорыі важкасці. Паводле свайго сацыяльнага статусу настаўнікі (як і абсалютная большасць насельніцтва) з пункту гледжання "віны калектыўнага супрацоўніцтва" падлягалі пад самую лёгкую ступень абвінавачвання, і абсалютная большасць з іх захавала свае месца працы. Паколькі на дзяржаўным узроўні было заяўлена, што ніякага палявання на настаўнікаў не будзе, працэс прайшоў даволі спакойна. Як дзяржаўныя службоўцы настаўнікі аказаліся ў лепшым становішчы, чым іншыя: яны фактычна да пенсіі замацаваліся на сваіх месцах. Канешне, тыя, - калі гэта было засведчана відавочцамі – хто зламысна чыніў здзек і пераслед вучняў (асабліва абітурыентаў), абвінавачваючы бацькоў у апалітычнасці, былі па магчымасці адпраўлены датэрмінова на пенсію або пераведзены на іншую працу. Усё залежыла ад ступені розгаласу і пазіцыі грамадскасці. Калі настаўнікі ўдзельнічалі ў выбарчых і іншых кампаніях, актыўна супрацоўнічалі з антыдэмакратычным рэжымам – яны мелі вялікі маральны ўціск, шмат з іх былі звольнены. (Часам настаўнікі ГДР прымушалі вучняў даносіць на бацькоў, ці далучыліся тыя да розных нібыта грамадскіх капаніяў, якія праводзіліся ўладамі (напрыкдад, кампанія "Не глядзім 4-ты канал" (канал, па якім ішла трансляцыя з заходняга Берліну), ці кампанія "Напішы ліст сябру з СССР"). Усе настаўнікі прайшлі адпаведныя курсы перападрыхтоўкі. Часта не перапыняючы асноўную працу, калі мясцовыя ўмовы не дазвалялі знайсці замену.

Спадар Гаўк быў за тое, каб тэрмін разгляду справаў быў працягнуты (афіцыйна на праверку было адмерана 7 год – да 1997), бо не ўвесь архіў быў вывучаны. Аднак па фінансавых ды іншых меркаваннях статус установы быў зменены: яе зрабілі фактычна аддзелам Федэральнага архіву. Наступніцай сп. Гаўка стала Мар'яна Біртлер (Marianne Birthler).

Як святар і беспартыйны грамадзянін Ёахім Гаўк адмовіўся вылучацца ў дэпутаты і займаць высокія пасады. Атрымаўшы нямала ўзнагародаў і ганаровых тытулаў, ён застаўся толькі ў адной няўрадавай арганізацыі з назвай "Мост праз Атлантыку" ("Atlantik-Brücke"). У сваім апошнім інтэрв'ю на пасадзе ўпаўнаважанага ён сказаў: "Нашыя ўспаміны пра мінулае – гэта бясконцы тэрапеўтычны працэс".

***АСОБА Ў АДУКАЦЫІ***

# Наталля ІЛЬІНІЧ: бываюць злачынцы, якія не ўчынілі зла

У жыцці настаўніцы гісторыі Талькаўскай школы Пухавіцкага раёна Наталлі Ільініч амаль адначасова адбыліся дзве падзеі: калегі намінавалі Наталлю на званне "Беларускі настаўнік года - 2007" і супраць яе ўзбудзілі крымінальную справу па артыкуле "падбухторванне да здзяйснення злачынства", у выніку якой выдатная настаўніца атрымала паўтара года выпраўленчых прац. На першы погляд, падзеі не звязаныя паміж сабою, аднак сама Наталля ўпэўненая, што не была б яна добрым педагогам, не атрымала б такога пакарання.

Наталля Ільініч – настаўніца гісторыі і сусветнай мастацкай культуры, працуе ў Талькаўскай школе з 1985 года, як скончыла гістарычны факультэт БДУ. Да Талькі, як кажуць, прыкіпела сэрцам і душой. Яна натхняе на краязнаўчую і даследчую працу ўжо якое пакаленне мясцовых школьнікаў. Нядаўна ў сецыве з'явіўся школьны краязнаўчы сайт http://talka.info, які нагадвае вялікі музей – столькі там змешчана звестак пра гісторыю, славутых людзей, прыроду, паходжанне назваў наваколля.

*Працяг на ст 4.*

# Асоба ў адукацыі: Наталля ІЛЬІНІЧ

Наталля Ільініч з'яўляецца заснавальніцай і душою Талькаўскага фестывалю, які штогод адбываецца на беразе Талі. Пад пажоўклай лістотай магутнага дуба збіраюцца прыхільнікі беларускай музыкі, паэзіі. У фестывальныя дні ў Тальку з'язджаюцца ўсе, хто любіць спяваць, танцаваць, чытаць вершы, у тым ліку свае. Сёлета ўпершыню над Талькаўскім святам музыкі і спеваў навісла пагроза. Аказваецца, на гэты раз трэба было падаць заяўку на масавае мерапрыемства за 15 дзён. Арганізатарцы свята паведамілі, што дзверы клуба для культурнага мерапрыемства будуць зачыненыя. Няўжо ў нашай краіне ўжо нельга спяваць без дазволу?!

З гэтай прычыны фэст прайшоў трошкі ў іншым фармаце, чым планавалася. Прыехалі тыя, хто не спужаўся забароны: моладзь з Мар'інай Горкі, з Мінска, Магілёва, Асіповічаў, Пінска, Рэчыцы, Салігорска. Спяваў свае песні бард Андрэй Мельнікаў з Гомеля, іграў на дудзе і спяваў Зміцер Сідаровіч, а моладзь падпявала і танчыла народныя танцы. Чытала свае вершы паэтка Таццяна Барысік з Магілёва, спявалі Аляксей Галіч, Мікола Рудакоўскі, Ганна Чумакова, Ігар Сімбіроў. Прайшло свята на гістарычным месцы: у лесе, на той палянцы, дзе ў пачатку 1930-х гадоў стаяла «стража» – хата-леснічоўка, дзе летаваў з сям'ёй Якуб Колас. Не перашкодзілі фэсту кароткачасовы дождж, а таксама машыны, што ездзілі па Тальцы следам за гасцямі.

Рэч ў тым, што Наталля Ільініч з'яўляецца мясцовай дэмакратычнай актывісткай. Яна займае актыўную пазіцыю падчас усіх грамадскіх і палітычных кампаніяў: удзельнічае ў незалежным назіранні падчас выбараў, збірае подпісы за прадстаўнікоў аб'яднаных дэмакратычных сілаў, працуе ў грамадскай арганізацыі "Таварыства беларускай школы". Наталля Ільініч перакананая, што Беларусь – гэта еўрапейская краіна, з багатай гісторыяй, дэмакратычнымі каштоўнасцямі, адкрытымі і шчырымі людзьмі. Таму і працуе Натальля, каб яе вучні не страцілі свае карані, не былі ізаляванымі ад іншых еўрапейскіх народаў, ведалі гісторыю і клапаціліся пра будучыню. Дзякуючы настаўніцы гісторыі ў Талькаўскай школе дзейнічае музей, краязнаўчы гурток, Школьны еўрапейскі клуб, у якім збіраюцца вучні і вучаць гісторыю і культуру іншых народаў. Нават у конкурсе Школьных еўрапейскіх клубаў "Веды пра Еўропу" выйгралі паездку ў Літву. Таленавіты педагог нікому не навязвае свае погляды, але і не хавае іх, як большасць яе калегаў. Таму і любяць яе вучні, паважаюць калегі і аднавяскоўцы. Часта гэта не вітаецца мясцовымі ўладамі, але не для ўлады мы жывем і працуем, а для людзей і чыстага сумлення.

Наталля навучыла гэтаму і сваю дачку Дар'ю - зараз студэнтку гістфака БДУ, якая нядаўна з'ездзіла ў Польшчу па студэнцкім абмене, а потым адмовілася пісаць даносы ў КДБ на сваіх сяброў. Не вучылі яе гэтаму ні маці, ні школа. Вось і ўзбудзілі па заяве КДБ крымінальную справу супраць маці, нібыта тая выпрошвала ў мясцовай лекаркі даведку для дачкі. І супраць Дашы таксама зараз пачалі справу па тым жа артыкуле. Для дзяўчынкі такі сцэнар не быў нечаканым. Той кадэбіст, на размову з якім выклікалі яе ў дэканат, распавёў дакладны расклад, паводле якога дзяўчыну і маці будуць судзіць, калі тыя адмовяцца ад супрацоўніцтва.

На судзе Наталля не прызнала сваёй віны. Яна ўпэўненая - у злачынстве, у якім ніхто не пацярпеў, ніхто не страціў ні капейкі грошай, не можа быць злачынцаў.

Пакуль яшчэ Наталля працуе ў школе, Даша вучыцца ў БДУ, а мы будзем сачыць за справай, каб ведаць сапраўдных злачынцаў і сапраўдных настаўнікаў.



*На здымку Наталля Ільініч з дачкой Дар'яй у залі суда.*

# Метадычныя навінкі

**матэрыялы, дасланыя на конкурс "Ноўтбук для актыўнага настаўніка" http://nastaunik.info/notebook2007**

**• Намінацыя «Метадычнны дапаможнік»**

1) Міхась Булавацкі. Дапаможнік для школьнікаў «Цалкам зразумелая трыганаметрыя», «Жывая трыганаметрыя»
2) Іван Храпавіцкі. Электронная кніга «Эўрыстычны палігон для матэматыкі" – кампакт-дыск; Матэматычна-педагагічнае даследаванне «Канфігурацыйны падыход»
3) Мікалай Іода. Сайт http://zloy-fizruk.narod.ru
4-5) Аляксандр Плятнёў. «Лабараторная на EXCELlent. Арганізацыя лабараторных работ з выкарыстаннем электронных табліц», "Метадычны дапаможнік для падрыхтоўкі да выпускнога іспыту па фізіцы за курс сярэдняй школы".
6) Ліна Пугач. Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення на ўроках матэматыкі.
7) Аляксандр Сядзяка. Методыка самаправеркі і узаемаправеркі самастойных работ на уроках фізікі і 10-бальная сістэма ацэнкі ведаў.
8) Лера Сом. "Ілюстрацыі да ўрокаў выяўленчага мастацтва ў 5 класе агульнаадукацыйнай школы"
9) Наталля Ільініч. "Рабочыя сшыткі па гісторыі і ЧГД"
10) Галіна Альшэўская "Метад праектавання ў дзейнасці класнага кіраўніка як адзін з эфектыўнейшых сродкаў развіцця прыродных талентаў кожнага дзіцяці"

**• Намінацыя «Сучасны урок»**

1) Лера Сом. Урок выяўленчага мастацтва «Пейзаж ў Беларускім мастацтве»
2) Іван Кульбеда. Абагульняючы ўрок у 11 класе "Інтэлектуальнае спаборніцтва "Фізіка з беларускага куфэрка"
3) Тацяна Лабанава. Урок па гісторыі Беларусі 10 класса "Станаўленне Вялікага княства Літоўскага падрыхтаваны з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогіяў".
4)Лідзія Раманчук, Ала Буцько. Занятак факультатыву ў 8 класе "Сінтаксіс і камп'ютэрныя тэхналогіі" па тэме: "Зваротак", прысвечаны вясне. Інтэграваны ўрок у 9 класе з прымяненнем кам'ютэрных тэхналогій па тэме: "Складаназалежныя сказы"
5) Вольга Рудая. Гульня "Разумнікі і разумніцы" па творах М.Гарэцкага "На імперыялістычнай вайне" і Э.М. Рэмарка "На Заходнім фронце без пераменаў"
6) Вера Сідарэнка. "Першы ўрок у 2-м класе".
7) Ірына Сыско. Урок развіцця мовы ў 4-м класе. Тэма: Мова – плынь часу.
8) Ірына Валынец. Урок англійскай мовы 2 клас па падручніку "Цудоўны куфэрак" пад рэдакцыяй Седуновай Н.М. Тэма: "In the Lesson"
9) Гелена Белязюн. Тэма: "Фактары, якія ўплываюць на раслінныя супольнасці". Урок для 7 класа па дванаццацігадовай праграме.

*Усе матэрыялы глядзіце тут: http://nastaunik.info/notebook2007*

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта ***Nastaunik.info***
Адрас для допісаў: ***nastaunik.info@gmail.com***
Наклад ***200*** асобнікаў